# § 73. Адмоўныя займеннікі

**469.** Прачытайце загадкі Н. Гілевіча, устаўляючы замест пропускаў словa *ніхто* ці *нішто*. На што яны ўказваюць?

… не ляцела,
… не спужала,
А ўся затрымцела,
А ўся задрыжала[с].



Стаіць бычок —
Асмалены бачок.
Увесь век смаліцца,
І … не зжаліцца.



Назавіце сінонімы ў тэксце.

! **Адмоўныя** займеннікі ўказваюць на адсутнасць асобы ***(ніхто)***, прадмета ***(нішто)***, якасці ***(ніякі)***, прыналежнасці ***(нічый)***.

Адмоўныя займеннікі ўтвараюцца ад пытальных пры дапамозе прыстаўкі ***ні-***: *ніхто, нічый, колькі*.

Калі ***ні*** аддзяляецца прыназоўнікам, то займеннік пішацца ў тры словы: *ні да чо́га, ні да ко́га, ні з кім, ні пры я́кіх.*

Адмоўныя займеннікі змяняюцца, як пытальныя і адносныя, і ўжываюцца ў сказах, дзе ёсць адмоўе ***не*** ці словы ***нельга, няма***: *у класе нікога няма, нікога не забыць, нічога нельга.*

**470.** Прачытайце табліцу. Зрабіце вывад пра асаблівасці змянення адмоўных займеннікаў.

| **Склон** | **Скланенне адмоўных займеннікаў** | | | |
|---|---|---|---|---|
| Н. | *ніхто́* | *нішто́* | *нічы́й* | *нія́кі* |
| Р. | *ніко́га (ні ад ко́га)* | *нічо́га (ні ад чо́га)* | *нічыйго́ (ні ад чыйго́)* | *нія́кага (ні ад я́кага)* |
| Д. | *ніко́му* | *нічо́му* | *нічыйму́* | *нія́каму* |
| В. | *ніко́га (ні на ко́га)* | *нішто́ (ні на што́)* | *нічыйго́ (ні за чыйго́), нічы́й (ні на чы́й)* | *нія́кага (ні на я́кага), нія́кі (ні на я́кі)* |
| Т. | *ніκі́м (ні з кі́м)* | *нічы́м (ні з чы́м)* | *нічыі́м (ні з чыі́м)* | *нія́кім (ні з я́кім)* |
| М. | *ні па кі́м* | *ні па чы́м* | *ні па чыі́м* | *ні па я́кім* |



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**471.** Пісьмова адкажыце на пытанні, ужываючы адмоўныя займеннікі.

1. Хто вам расказаў пра гэты выпадак? 2. Чым ты будзеш займацца пасля заняткаў? 3. За што ты будзеш перажываць? 4. Якім дыванам заслаць падлогу? 5. На якім прыпынку ты выйдзеш? 6. На чыім музычным інструменце ты іграеш?

Падкрэсліце адмоўныя займеннікі. Вызначце, у якой форме яны ўжыты.

**472.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай.

Часта прапануюць нешта, што рабіць няма ахвоты. Напрыклад, хтосьці кліча ў кіно[м], якое не выклікае ў цябе ніякай цікавасці. Ёсць некалькі правіл, як трэба правільна адмаўляць.

Пакажы сваім сябрам, што заняты якой-небудзь важнай справай. У такім выпадку нікога не пакрыўдзіш.

Аднак без ніякіх тлумачэнняў упэўнена скажы «не» ў адказ на нахабную просьбу. Нічога не тлумач, а ўпэўнена адмаўляй.

Але памятай: уменне казаць «не» ні ў якім разе не распаўсюджваецца на просьбы самых дарагіх[м] табе людзей — бацькоў, дзядуляў і бабуль *(З часопіса «Вясёлка»)*.

Выпішыце асобна няпэўныя і адмоўныя займеннікі ў пачатковай форме. Раскажыце пра асаблівасці іх значэння і змянення.

Праскланяйце словазлучэнні *якая-небудзь справа*, *нешта цікавае*.

Раскажыце, як вы дапамагаеце сваім родным. Ці заўсёды вы гатовы выканаць іх просьбы?

## *Гавары і пішы правільна*

Рускім формам займеннікаў ***не́кого, не́чего, не́ с кем, не́ в чем*** у беларускай мове адпавядаюць спалучэнні ***няма каго́, няма чаго́, няма з кі́м, няма ў чы́м***.

**473.** Прачытайце ўстойлівыя выразы. Як вы разумееце іх значэнні?

Нечего делать, ничего не значит, нечего сказать, ничего подобного, ни за что ни про что, и думать нечего, ни при чём, никоим образом, как ни в чём не бывало, нечем крыть, ни в коем случае.

Перакладзіце выразы на беларускую мову. Вызначце разрады займеннікаў, што ў іх выкарыстаны. Раскажыце пра асаблівасці перакладу.

Складзіце сказы з фразеалагізмамі, якія маюць значэнні ‘поўнасцю згодны’ і ‘няма чаго сказаць у апраўданне’.

**474.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак.

Максім займаецца ў гуртку аві..мадэлявання. Сёння *(ён)* разам з сябрамі атрымалася запусціць новую мад..ль сам..лёта. Дзеці захапіліся *(гэта)* відовішчам і не заўважылі, як да *(яны)* пад..шлі два дзядулі.

— Прыгожа ляціць! — прамовіў адзін з *(яны)*. — У час *(В/в)*ялікай *(А/а)*йчыннай в..йны *(мой)* бацьку давялося быць лё..чыкам. У *(ён)* ордэн ёсць і *(іншы)* у..нагароды.

Сябры па..трымалі *(гэта)* размову. Яны ра..казалі пра *(свой)* прадзедаў, *(які)* у гады в..йны таксама змагаліся з фашыстамі.

— А *(хто)* пастаўлены помнік на ў..крайку вёскі? — раптам спытаў Паўлік. — Каля *(гэты)* помніка заўсёды л..жаць свежыя кветкі.

— Гэта бра..кая магіла, — адказаў адзін дзядуля. — Імёны многіх г..рояў, *(які)* там пахаваны, засталіся нев..домымі. *(Такі)* помнікаў на *(Б/б)*еларусі шмат. Многа гора прынесла в..йна на *(наш)* з..млю. Не стала *(кожны)* тр..цяга беларуса. *(Мы)* нельга забываць ні *(пра)* *(хто)* з *(яны)*. Трэба памятаць пра по..віг *(свой)* народа. Ні*(хто)* не забыты, і ні*(што)* не забыта *(Паводле Г. Бітно, А. Камяк)*.

Чаму каля помніка на ўскрайку вёскі заўсёды ляжаць жывыя кветкі?

Запішыце тэкст, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Абгрунтуйце напісанне.

Зрабіце пісьмовы марфалагічны разбор двух займеннікаў з тэксту (парадак і ўзоры разбору змешчаны на форзацы 1).

Карыстаючыся рознымі крыніцамі інфармацыі (напрыклад, кнігай «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (V—IX класы)), раскажыце пра помнікі дзецям — ахвярам Вялікай Айчыннай вайны.

**475.** Выканайце інтэрактыўнае заданне па раздзеле «Займеннік».



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

## Правяраем сябе

1. Якую ролю адыгрываюць займеннікі ў тэксце?
2. На якія разрады па значэнні падзяляюцца займеннікі?
3. Прывядзіце прыклады займеннікаў, якія ўказваюць на прадмет, прымету, колькасць.
4. Займеннікі якіх разрадаў змяняюцца, як прыметнікі? Прывядзіце прыклады.
5. Чым адрозніваюцца прыналежныя займеннікі ***яе, яго, іх*** ад падобных да іх асабовых?
6. Ці правільна ўжыты формы займеннікаў у наступных словазлучэннях: *прымушаць самаго сабе, не дазваляць самаму сабе*?
7. Якую форму маюць займеннікі ***нехта, нешта, ніякі*** ў месным склоне? Запішыце гэтыя формы займеннікаў. Складзіце з імі сказы.

**476.** Прачытайце тэкст, раскрываючы дужкі. Падбярыце да яго загаловак.

Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь — значнае свята б..ларускай дз..ржаўнасці. 3 ліп..ня — дзень вызвалення Мінск.. ад н..мецка-фашыс..кіх захопнікаў. Для *(кожны)* беларуса *(гэты)* дата з’яўляецца сімвалам свабоды, мір.. і подзвігаў. Пасля 1996 года яна стала яшчэ і сімвалам незалежнасці краіны і народ.., *(які)* давялося *(сам)* клапаціцца пра *(свой)* будучыню. Дата 3 ліп..ня сімвалізуе сув..зь паміж *(той)*, хто ваяваў за мір, і *(той)*, хто сёння працуе для разві..я і дастойнай будучыні *(наш)* краіны.

Святочныя мерапрыемствы праходзяць па *(увесь)* краіне. Беларускі народ аддае даніну павагі гераізму і стойкасці салдат, падпольшчыкаў і партызан. Мы ўспамінаем таксама працоўны подзвіг *(той)*, хто падымаў краіну з руін у пасляваенныя гады.

Беларусь памятае, *(колькі)* жыхароў краіны забрала вайна. Таму мэта *(наш)* дзяржавы — захаваць мір. Беларусы жадаюць *(увесь)*, хто жыве на Зямлі, шчасця і дабрабыту *(Паводле В. Ванінай)*.

Спішыце першы абзац тэксту, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары.

Якія адносныя займеннікі служаць для сувязі частак у складаным сказе?

Які сказ мае наступную будову? [——— ═══], (хто ═══).

Увяіце, што вы прымаеце ўдзел у акцыі «Паштоўка ветэрану». Напішыце віншаванне ўдзельніку Вялікай Айчыннай вайны.

**477.** Прачытайце тэкст. Пра што вы даведаліся?



На киностудии «Беларусьфильм» создан мультфильм «Приключения Нестерки». В нём рассказывается о герое народных легенд и преданий.

Вместе со своими верными друзьями — псом и котом — Нестерка находит выход из любой ситуации. Он путешествует по своей родной земле, никогда не грустит и всегда готов прийти на помощь людям.

Запішыце тэкст па-беларуску. Растлумачце напісанне займеннікаў.

## Слоўнік

приключения — *прыгоды*
предание — *паданне*
пёс — *сабака*
выход — *выйсце*
путешествовать — *падарожнічаць*
грустить — *сумаваць*

**478.** Спішыце прыказкі і прымаўкі, раскрываючы дужкі.

1. Ганарлівы[м] ды ўпарты — *(нішто)* не варты. 2. Дзе хвоя ні стаіць[ф], а ўсё *(свой)* бору шуміць. 3. *(Ні)*за*(што)* на свеце. 4. Будзь *(свой)* слову гаспадар. 5. Вока *(ні)*кому не запарушыць. 6. Чым *(абы)*які, то лепш *(ні)*які. 7. Шчасця не купіш *(ні)*за*(якія)* грошы. 8. Хлеб над *(увесь)* пануе. 9. *(Ні)*у*(якім)* разе.

Растлумачце напісанне займеннікаў.
Раскрыйце сэнс першай прыказкі.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі